Анатоль Сыс



...маліцеся за нас – пісьменьнікі, вучоныя,
партыйныя работнікі –
калі вы сапраўды любіце Беларусь...

# «Любіце нас такімі, якімі стварылі...»

*Гутарка Алеся ЛІПАЯ з Анатолем СЫСОМ*

***Амаль увесь наклад паэтычнага зборніка Анатоля Сыса "Агмень", які выйшаў нядаўна ў серыі "Бібліятэка часопісу "Маладосць", раскуплены за некалькі тыдняў. Для першай кнігі, асабліва беларускай, посьпех небывалы за апошнія гадоў дваццаць. Праўда, імя аўтара дастаткова шырока вядомае, і ня толькі па публікацыях яго вершаў у газетах і часопісах. Многія ведаюць Анатоля як аднаго з арганізатараў моладзевага літаратурнага аб'яднаньня "Тутэйшыя" пры СП БССР. І ў гэтай ролі людская пагалоска малюе яго непаважаючым традыцыі і некаторых літаратараў старэйшага ўзросту, якія толькі сьпявалі дыфірамбы і замоўчвалі хваробы грамадства ("Прыкарытнікі" – так ахрысьцілі іх "Тутэйшыя" ў сваім "Маніхвэсьце").***

***Аднак чуткі – гэта панятак, які зусім не гаран-***

***туе праўду. Хто ж ён, Анатоль Сыс? Пра гэта, думаецца, лепш спытаць у яго самога.***

– Пакуль быў жывы мой бацька, я яго вельмі любіў, але даволі рэдка я даваў яму мажлівасьць гэта адчуць. Ёсьць у мяне такая рыса характару – жорсткасьць, якая ўжываецца з сентыментальнасьцю. Бывае, калі ідуць вершы, ваяўнічыя вершы, я адчуваю адчай, адчай да сьлёз… Не, я плачу не па сабе, а над страчанымі ці самаўхіліўшыміся пакаленьнямі, над сваімі старэйшымі таварышамі па пяры: Крапівою, Танкам, Панчанкам, Барадуліным, Стральцовым, Някляевым, над земляком Шамякіным…

Каго любіць? Радзіму? Але радзімай для мяне быў заўсёды падвыпіўшы бацька. І той час, калі ён жыў – таксама Радзіма. Каго любіць – прэзідэнта АН БССР Івана Навуменку? За тое, што ён мяне і маіх таварышаў па “Тутэйшых” літаральна выкінуў на праезную частку сталіцы з актавае залы Акадэміі, якая хацела нас пачуць. Ці ня гэтак у свой час абыйшліся з першым прэзідэнтам гэтай жа Акадэміі Ігнатоўскім, Ластоўскім, Лёсікам… Летась – з паэтам і філосафам Алегам Бембелем. З партыі і працы – толькі за тое, што нехта ў Лондане выдаў яго філасофскае дасьледаваньне “Што мы думаем пра цябе, родная мова?” Але ён жа да гэтага прыніжаўся, абіваючы парогі нашых выдавецтваў. Адверглі. Разам з прадмовамі і пасьляслоўямі Караткевіча, Панчанкі, Барадуліна.

“Хто ж ён, Анатоль Сыс?” Можа, адзін з прэтэндэнтаў быць выгнаным? Мяне пакуль не цягалі на допыты, мяне ня білі дзяржальнам пісталету па галаве, мяне не палохалі, зьдзекуючыся, Курапатамі… Таму я не асуджаю бацькоў, але я і не шукаю ім апраўданьня. Майго бацьку загубіла гарэлка. Аднак ягонае пакаленьне травілі яшчэ больш жахлівымі наркотыкамі, імя якім касмапалітызм, альбо прагнілы інтэрнацыяналізм, кар’ерызм, культ жывата ды задніцы…

Што пагубіць мяне… нас – вашых дзяцей? Дык любіце нас такімі, якімі стварылі, дык маліцеся за нас – пісьменнікі, вучоныя, партыйныя работнікі – калі вы сапраўды любіце Беларусь.

***– Раз ужо ты згадаў пра “Тутэйшых”, пра іх будзе і маё наступнае пытаньне. Лічу, што рэдкі чытач ведае пра дзейнасьць таварыства, газеты даюць толькі спрэчкі вакол вашай пазіцыі. Раскажы, якія задачы перад сабой ставяць “Тутэйшыя”, чым канкрэтна займаюцца?***

– “Літаратура – гэта Бацькаўшчына” – гэтымі словамі пачынаецца наш “Маніхвэст”. Мы ня чыста літаратурнае аб’яднаньне. Тлумачыцца гэта тым, што ў свой час, значыць два гады таму, мы “аддзяліліся” ад “Талакі”, узяўшы з сабою пэўны досьвед у справе ажыўленьня, а лепш сказаць – рэанімацыі беларуса. Няхай я альбо нехта іншы з “Тутэйшых”, да прыкладу Міхась Скобла, не далічымся вершаў, аднак гэта кампенсуецца ў некалькі разоў нашымі паходамі “ў народ”. Ня буду казаць за ўсіх “Тутэйшых”, скажу за сябе: у мінулым месяцы правёў два ўрокі роднай літаратуры ў другім беларускім класе сярэдняй школы № 20. Першага кастрычніка выступаў перад калгасьнікамі і гасьцямі Крошына на адкрыцьці гісторыка-мастацкага музею ў мясцовым адрэстаўраваным касьцёле. Разам з беларускім рок-гуртом “Мроя” быў тры дні ў Львове па запрашэньні “Лэвы” – самай моцнай адраджэнскай

арганізацыі на Украіне. Зараз мы рыхтуем разам з “Талакой” мітынг, прысьвечаны памяці нашых продкаў – “Дзяды”.

Па традыцыі мітынг планавалася правесьці 30 кастрычніка каля помніку Янку Купалу. Але сёлета ў гаркаме партыі нам адмовілі, спаслаўшыся на тое, што там у гэты ж дзень будуць праводзіцца Дні Брэсцкай вобласьці, і паміnаньне “Дзядоў” не спалучаецца з намечанай праграмай. А “Дзяды” ж гэтым разам будуць прысьвечаныя ахвярам паўстаньня Кастуся Каліноўскага, сталінскіх рэпрэсіяў, партызанскай вайны ў Беларусі… Няўжо гэта абмінула Брэсцкую зямлю?

Мы ўсё ж адкрыем “Дзяды” 30 кастрычніка ў 11.00 каля ўрочышча Курапаты. Там-та ўжо, я думаю, мы нікому ня будзем перашкаджаць.

Што яшчэ сказаць пра “Тутэйшых”? Калі размова зайшла пра “Дзяды”, дык напомню, што мінулай восеньню мы ўпершыню ў Беларусі зачыталі сьпіс партыйных, дзяржаўных дзеячоў, пісьменьнікаў рэспублікі, якія патрапілі пад сталінскія рэпрэсіі. А як нас білі за тое, што мы гэтыя рэпрэсіі назвалі, на наш погляд, самым дакладным словам “генацыд”… І толькі артыкул Васіля Быкава ў “Советской Белоруссии” спыніў зьбіцьцё, а потым, недзе праз паўгоду і ў Маскве Валянцін Распуцін напісаў, што сапраўды быў генацыд супраць свайго ж народу.

***– Ну а цяпер – пра тваю “галоўную справу” – творчасьць. Анатоль, чаму менавіта так –“Агмень” – ты назваў свой першы зборнік?***

– “Агмень” (па-руску – “очаг”) – гэта метафара Радзімы. Часьцінка маёй Радзімы, якую я насіў у сабе, якая саграvала мяне падчас службы ў Польшчы. Прычым слова гэтае амаль забытае намі. Я знайшоў яго толькі ў “Расейска-Крыўскім (Беларускім) слоўніку” Вацлава Ластоўскага, кнізе рэдкай. Бо адзін з абавязкаў пісьменьніка – вяртаньне сябе праз вяртаньне страчанага народам.

***– Я ведаю, што вершам, якія ўвайшлі ў тваю кнігу, ужо не адзін год. Як ты цяпер, з вышыні большага майстэрства і жыцьцёвага досьведу, да іх ставішся?***

– Амаль увесь “Агмень” напісаны ў 82-84 гадах у войску. Па іроніі лёсу, менавіта 1983 годам і пазначылі першую старонку кнігі, але потым знайшлі памылку, выправілі ўжо ад рукі тройку на васьмёрку. Гэта відаць няўзброеным вокам. Як бы там ні было, зборнік выйшаў. Пакуль мне сустрэўся толькі адзін чалавек, які сказаў, што дарэмна я надрукаваў раньнія вершы, маўляў, на гэта ёсьць пасьмяротны “збор твораў”. Я так ня думаю. Стаўлюся да іх, як да маленькіх дзетак, абдзеленых толькі таму, што яны нарадзіліся раней за сёньняшнія мае вершы.

***– Мне падалося, што “Агмень” як бы распадаецца на дзьве часткі. У паэмах, на мой погляд, больш недаказанасьці і сімвалізму, чым яны рэзка адрозьніваюцца ад вершаў, якія я, напрыклад, прымаю хутчэй, чым “Алаізу” і “Агонь-Птушку”.***

– Я лічу, што ў цябе склалася няправільнае ўражаньне. “Алаіза” і паэмаабсурд “Агонь-Птушка” – гэта крылы кнігі. Яны вызначаюць яе тон. Яны, у нейкай меры, – пратэст супраць жорсткасьці, якую я сустрэў у войску, а войска маіх часоў – гэта гусенічная машына, якая падмінала пад сябе ўсё і ўсіх… Гэтыя паэмы – апагей настальгіі па Радзіме (зрэшты, не пішы ў інтэрв’ю “настальгія”, а то ўзьнікне асацыяцыя з Вазьнясенскім,

а яго вершы я не люблю. Скажу лепш – туга, боль, адчай і, разам з тым, разуменьне непазьбежнасьці). Так, відаць, павінна быць…

***– А зараз, Анатоль, некалькі пытаньняў, на якія, я лічу, ты не адказаў у зборніку, задаўшы іх…***

– Але, прабач, паэт не павінен сябе разжоўваць. Інакш ён будзе прапаноўваць чытачу ня вершы, жвачку. І наогул, калі ў краіне таталітарныя парадкі, то паэтаў у ёй рэкамендуецца ізаляваць. Яны, сапраўды, вельмі любяць задаваць пытаньні. (У дадзеным выпадку я менш за ўсё маю на ўвазе сябе). Бывае “нахабнічаюць”. І калі на гэтыя пытаньні не адказвае той, каму “па штату” гэта трэба рабіць – адкажа сам народ. І так адкажа…

***– І ўсё ж: “Навошта пра любоў крычаць?” Твой радок?***

– Мой. Усе пачынаючыя заяўляюць пра сябе патрыётыкай, пры чым – неглыбокай. Тым больш беларускі паэт – ён ня можа асэнсаваць сваю Радзіму на канкрэтным адрэзку беларусскай гісторыі. А паэт жа пачынаецца з таленту – як паэт. І як чалавек – з адчуваньня сваіх каранёў. Ён павінен урастаць у зямлю, чытачы павінны ўрастаць разам з ім. У Беларусі склалася такая палітычная, грамадская, культурная і моўная сітуацыя, што чытачам няма патрэбы ісьці за сваім нацыянальным паэтам кшталту Разанава, бо ніякой карысьці ад гэтага яны ня будуць мець. Можа быць, менавіта гэтая сітуацыя і абавязвае крычаць – шчыра, сэрцам крычаць пра любоў да Радзімы. Так, цяпер патрэбныя і трыбунныя вершы, каб абуджаць у беларусах беларускае. Паглядзі – на вуліцы шумна, лірыку не пачуюць.

***– “Зямля прыгожая кветкамі, моцная дрэвамі” – якая яна табою? – задаю зноў жа тваё пытаньне з “Агменю”.***

– Калі я стану гноем, тады ўбачаць, ці стане мой прах культурным пластом (у археалогіі так называюць пласт зямлі, у якім засталіся матэрыяльныя сьведчаньні культуры той ці іншай эпохі. – *А.Л.*). Наогул, нашае сёньняшняе пакаленьне Адраджэньня, павінна стаць гноем для наступных. Ня трэба зараз патрабаваць нараджэньня паэта рангу Купалы. Трэба рыхтаваць яго нараджэньне. А можа, ён ужо нарадзіўся і чытае “Буквар”, які выпраменьвае радыяцыю недзе пад Чарнобылем.

***– Ці змог бы ты спаліць свае вершы, каб абагрэць дарагога табе чалавека?***

– Змог бы, што я і зрабіў. Дарагі чалавек для мяне – чытач. Я паліў свае вершы…

***– Ты думаеш ад агню непрачытаных вершаў чытачу рабілася цяплей?***

– Яму стане цяплей. Я ня ведаю, хто гэта сказаў, але ён сказаў, што самае лепшае полымя – полымя спаленых паэтам рукапісаў, бо яно асьвятляе ягоны далейшы шлях.

***– Анатоль, некалькі словаў пра тваю будучую кнігу.***

– “Пан Лес”, так яна будзе называцца, зноў жа метафара Радзімы. Але больш глыбокая, больш духоўная, чым “Агмень”. Гэта ўжо філасофская праграма. Вядома, на маім ўзроўні і ўзроўні маладой беларускай паэзіі – праграма для беларуса, які хоча стаць такім, а ня быць толькі тутэйшым.

***P.S. ад аўтара інтэрв’ю.*** Дадам толькі, што ў наступным годзе павінна выйсьці новая кніга Анатоля Сыса “Пан Лес”. У тэмплане выдавецтва “Мастацкая літаратура” яна стаіць пад назвай “Краіна вера-

соў”. Наклад усяго 5000 асобнікаў. Зьвяртаюся да вас, чытачы “Знамя юности” і да кнігарняў рэспублікі замаўляць “Пан Лес”. “Пан Лес” – гэта катарсіс, праз які прайшоў Анатоль Сыс. Можа і ў вас гэтая кніга зьнішчыць хоць бы адну заразную бацылу.

***P.S. ад Анатоля Сыса.*** Беларуская мова павінна стаць дзяржаўнай у рэспубліцы. Усе гэтыя праграмы аб разьвіцьці двухмоўя ў Беларусі – гэта працяг той дыверсіі, якую задумаў яшчэ Сталін са сваімі марыянеткамі. Да таго часу мы культурна ня будзем размаўляць і ведаць чужую мову, пакуль наша родная мова не ўрасьце ў нашыя целы і душы. Няхай публікацыя маіх вершаў у “Литературной газете” будзе апошняй. Я забараняю перакладаць мае вершы на рускую мову. І толькі калі беларуская мова сапраўды стане раўнапраўнай сярод моваў Саюза ССР – мой запавет страціць сілу. Я хачу, каб беларусы чыталі мяне ў арыгінале!

А.С.

***P.P.S. ад аўтара інтэрв’ю.*** Гэтае інтэрв’ю некалі друкавалася на беларускамоўнай старонцы “Родны склон”, што выходзіла з маёй ініцыятывы ў самай масавай па тых часах газеце “Знамя юности”. Рубрыка была прысьвечаная папулярызацыі беларускай мовы, літаратуры ды гісторыі. Зразумела, нельга было не адгукнуцца на выхад у 1988 годзе першай Анатолевай кнігі, вершы якога я добра ведаў і любіў яшчэ з часоў сяброўства ў “Тутэйшых”. І рады, што мне ўдалося разгаварыць Анатоля, выманіць яго з-пад панцыру іранізму, які ён насіў па жыцьці.

Нельга казаць, што толькі ў гэтым інтэрв’ю – сапраўдны Сыс. Але без такога шчырага расповяду пра сябе, пра сваю творчасьць і сьветапогляд цяперашні партрэт паэта быў бы бяднейшы.

...У 2002 годзе пасьля прэзентацыі “Верша на Свабоду” (кнігі з бібліятэкі “Радыё Свабода”) мы невялікай кампаніяй апынуліся на Толевай кватэры. У нейкі момант я заўважыў, што Анатолю карціць кінуць паэтычны выклік. І сапраўды, неўзабаве ён выдаў: “Памрэш сыты ці галодны, а якая розьніца...” Сьледам я прачытаў свае радкі:

У тым пакоі, дзе Сьмерць, –
Столь белая.
Белыя сьцены.
І нейкі вялізазны зьвер
узлазіць табе на калені.
І ў вочы твае глядзіць.
І гэтак гучна вуркоча,
нібыта адзін на адзін
з табою застацца хоча.
Але ты яму ня вер!
Няма ратунку ў падмане:
у тым пакоі, дзе Сьмерць,
ён кожнага так прымае...

Мне здалося, што слухачы прыязна паставіліся да майго верша, і пакідаў я кампанію з пераможным пачуцьцём. Пазьней аказалася, што Анатоля я так і не пераканаў...

***Каментар ад «Дзеяслова».*** Арыгінал машынапісу інтэрв’ю, не «адрэдагаванага» рэдакцыяй газеты «Знамя юности», захаваўся ў сябра Анатоля Сыса Алеся Бяляцкага, які і перадаў яго нам. Друкуем інтэрв’ю ў першапачатковым выглядзе з пасткрыптумам Анатоля Сыса.

# А сэрца ўжо захварэла на праўду…

*Сёньня многія на Беларусі чулі пра Анатоля Сыса-паэта… Некаторыя з нашых сучасьнікаў чыталі нават тое-сёе, яшчэ меней тых, хто захоплены яго палымянымі радкамі, і толькі адзінкі (блізкія сябры і таварышы) памятаюць Сыса як аднаго з пачынальнікаў новай хвалі адраджэнцкага руху на Беларусі, гарачага прамоўцу на шматтысячных мітынгах, паэта-трыбуна. Так, напачатку і ў сярэдзіне 80-х гадоў, Анатоль ня толькі стварыў свае лепшыя вершы, ён яшчэ пры гэтым быў палітыкам. Прычым нацыянальная сьвядомасьць, усведамленьне неабходнасьці пераменаў прыйшлі да Сыса амаль што аднačасна з паэзіяй. Але самастойна паходняй Адраджэньня Анатоль мог і ня стаць – каб ня кола сапраўдных сяброў, якія дапамагалі яму ўсьвядоміць неабходнасьць пераменаў, і да меркаваньняў якіх ён у тыя гады прыслухоўваўся. У дні жалобы па паэту Старшыня Партыі БНФ Вінцук Вячорка пісаў: “Сыс увайшоў у гомельскае кола нацыянальна сьвядомае моладзі як адзін з яго лідэраў. Быў актыўным удзельнікам стратэгічнае нарады прадстаўнікоў моладзевых беларускіх арганізацыяў узімку 1984 году ў Смольні ля Мікалаеўшчыны, якую ладзіла «Група «Незалежнасьць» і на якой было вырашана ствараць сетку арганізацыяў па ўсёй краіне. Так узьнікла Канфедэрацыя беларускіх суполак, якая, у сваю чаргу, сталася галоўным арганізацыйным апірышчам Беларускага народнага фронту”.*

*Першы несанкцыянаваны мітынг на Беларусі, які ў 1987 годзе арганізавалі Алесь Бяляцкі і Анатоль Сыс, быў прымеркаваны да гістарычнага беларускага сьвята Дзядоў. Ён адбыўся ў Менску ля помніка Янку Купалу 1 лістапада, 20 гадоў таму. Анатоль Сыс ва ўсю моц свайго маладога голасу паведаў тады праўду пра сталінскія рэпрэсіі ў дачыненьні да лепшых сыноў Беларусі, назваў сотню прозьвішчаў рэпрэсаваных дзеячаў, пісьменьнікаў, палітыкаў.*

*Роўна дваццаць гадоў назад ён першым, ці адным з першых на Беларусі, прамовіў на адноўленым сьвяце Дзядоў у 1987 годзе, сваё палкае слова. Затым былі іншыя мітынгі, Курапаты… Варта прыгадаць яшчэ і львоўскую гісторыю, пра якую некалі ў “Дзеяслове” падрабязна распавёў Мікола Сьцепаненка.*

*Зьмяніўся час, мітынговых прамоўцаў зьмянілі палітыкі – прафесіяналы, палітыкі-кабінетчыкі, якім так не стае сысавай жарсьці і пранікненага голасу трыбуна, што падымалі людзей.*

*Праўдзівым сьведкам таго, поўнага надзей на перамены часу, калі словы Анатоля Сыса знаходзілі водгук у тысячах сэрцаў, стаў гэты, ужо гістарычны дакумент, знойдзены ў матэрыялах Інстытута антрапалогіі і этнаграфіі Расійскай (!) Акадэміі навук. Новая хваля Адраджэньня толькі пачыналася. Маладыя патрыёты яшчэ ня ведалі ўсяго таго, што ведаем мы зараз, яны маглі памыляцца ў датах і некаторых фактах. Але іх беларускае сэрца ўжо захварэла на праўду…*

# «Самых разумных, самых сумленных…»

## Прамова Анатоля СЫСА на мітынгу, прысьвечаным памяці ахвяраў сталінскіх рэпрэсіяў 1лістапада 1987 году ў Менску.

Сёньня мы павінны ўспомніць тых, чыё жыцьцё было, бадай, самым трагічным ва ўсёй шматпакутнай нашай гісторыі. Беларускія інтэлігенты пачатку XX стагоддзя – частка нацыі. Іхні лёс – гэта лёс беларускага Адраджэньня. Мэтай і сэнсам жыцьця гэтых людзей была барацьба за нацыянальнае і сацыяльнае вызваленьне свайго народу. Гэта яны выдавалі першыя газеты і кнігі на беларускай мове, вяртаючы ёй былую славу. Яны былі званарамі-абуджальнікамі нацыянальнай, гістарычнай самасьвядомасьці беларусаў. Яны ішлі па нерушы. І, як у любой новай справе, непазьбежнымі былі памылкі, ваганьні, пошукі, аднак яны ішлі наперад, да агульнай мэты, абіраючы часам розныя шляхі. Таму яны апынуліся ў розных лагерах падчас рэвалюцыі і грамадзянскай вайны. Пасьля завяршэньня гэтага найвялікшага зруху ў душах, намерах і зьдзяйсьненьнях народаў ня толькі нашай краіны, але і ўсяго сьвету, мы бачым іх на чале будаўніцтва беларускай савецкай дзяржаўнасьці, частка працягвае барацьбу з рэжымам Пілсудскага ў Заходняй Беларусі, частка апынулася за межамі Беларусі ў эміграцыі.

Але вось у Савецкай Беларусі пачынаецца мірнае жыцьцё і разам з ім ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі ў форме «беларусізацыі». Адчыняюцца беларускія школы, засноўваюцца Беларускі універсітэт, Інстытут беларускай культуры – парастак будучай Акадэміі навук. Беларуская мова выкарыстоўваецца ва ўсіх партыйных, дзяржаўных, навуковых установах, за два заходы павялічваецца тэрыторыя БССР з пераважным беларускім насельніцтвам. Не было падставаў сумнявацца, што менавіта тут зьдзяйсьняюцца ідэалы беларускіх адраджэнцаў. Шматлікія эмігранты вяртаюцца на радзіму, займаюць высокія пасады ў культурных і навуковых установах: Ластоўскі В. – дырэктар Дзяржаўнага гістарычнага музею БССР, Цьвікевіч А. – супрацоўнік Акадэміі навук БССР, Некрашэвіч А. – віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук БССР, Лёсік Я. – выкладчык Белдзяржуніверсітэту, Гарэцкі М. – пісьменьнік, Мядзёлка П. – культурны дзеяч, Жылка У. – паэт, шматлікія іншыя. Здавалася, што наперадзе толькі шырокая дарога да росквіту. Але пачынаецца невытлумачальнае. Нашыя гісторыкі сарамліва маўчаць, чаму ў 1929-1931 гг. абрываюцца жыцьцяпісы шматлікіх выбітных беларускіх дзеячаў. Гэта не гады іх сьмерці. Проста ў энцыклапедычных даведніках няма зьвестак пра далейшы жыцьцёвы шлях гэтых людзей. Пракацілася першая хваля рэпрэсіяў – гэтак званая барацьба з нацыянал-дэмакратыяй. Пачалі з продкаў. Адначасова з заклікамі да «беларусіфікацыі» аб’яўляюцца сярэднявечнымі цемрашаламі Скарына, Будны, Цяпінскі; Скарына – «сярэднявечны манах з феадальна-зладзейскай ідэалогіяй», сьвяткаваньне 400-годдзя беларускага кнігадрукаваньня расцэньваецца як «шумная нацыяналістычная дэманстрацыя». Абвяшчаецца «песьняром прыгоньніцтва” В.Дунін-Марцінкевіч, «песьняром нова-народжанай буржуазіі»

– Ф.Багушэвіч. Потым узяліся за жывых. Вінавацяцца ў апяваньні дробнабуржуазнай ідэалогіі: М.Гарэцкі, У.Дубоўка, Я.Пушча, М.Зарэцкі, У.Жылка. У стварэньні міфічных контррэвалюцыйных арганізацыяў вінавацяць Я. Лёсіка, У. Ігнатоўскага, В. Ластоўскага, А. Некрашэвіча, навешваюцца цэтлікі «нацдэмаў з партбілетамі ў кішэнях» (словы Гая, першага сакратара ЦК КПБ) на З. Жылуновіча, З. Чарнушэвіча (сакратара Цэнтральнага Выканаўчага камітэту БССР), М. Чарота (рэдактара газеты «Савецкая Беларусь»), А. Сташэўскага (наркама юстыцыі БССР). Ці існавалі гэтыя арганізацыі на самой справе? Ні суд, ні навуковыя працы пра гэта ня сьведчаць. Затое ведаем, што вялікая частка абвінавачаных пазьней была рэабілітаваная (Я. Дыла, А. Бабарэка, Я. Пушча, У. Дубоўка).

Значыць, паклёп? Чаму тады не рэабілітаваныя астатнія? Можа, за старыя грахі? Аднак яшчэ ў 1925 годзе была абвешчаная амністыя, дзякуючы якой многія вярнуліся з-за мяжы, каб сапраўды працаваць на карысьць Радзімы.

Другая хваля рэпрэсіяў пачынаецца ў 33-м годзе. Ахвярамі становяцца дзеячы Беларускай рабочай грамады, партыі, якая змагалася ў Заходняй Беларусі супраць прыгнёту і апалячваньня беларусаў. Многія з грамадоўцаў апынуліся ў БССР. Іх сустракаюць кветкамі і высокімі пасадамі. А ў 1933-м годзе абвінавачваюць у стварэньні антысавецкай арганізацыі «Беларускі нацыянальны цэнтар». Лідэр Грамады Браніслаў Тарашкевіч яшчэ нічога ня ведае пра гэтую трагедыю. У 1933-м ён быў абмяняны Савецкім урадам і прыехаў з польскай турмы. Вялізная папулярнасьць Б. Тарашкевіча (завочна ён быў абраны ў прэзідыум антыфашысцкага камітэту ў Парыжы разам з Горкім і Тэльманам) не дазваляе расправіцца з ім адразу. Яго пазбаўляюць магчымасьці займацца літаратурнай і палітычнай дзейнасьцю.

Самы змрочны перыяд генацыду пачынаецца ў 1933-м годзе і працягваецца да 1939 году. Ён быў абгрунтаваны вядомым лозунгам пра ўзмацненьне класавай барацьбы. Стваральнікам чарговай антысавецкай арганізацыі абвяшчаецца Цішка Гартны, які пазьней звар'яцеў у Магілёўскай турме. Гінуць шматлікія з арыштаваных напачатку 30-х гг. нацдэмы, разам з імі расстрэльваюць і пераканаsuccеных камуністаў – партыйных і дзяржаўных работнікаў, адбываецца разгром Акадэміі навук і Саюзу пісьменьнікаў БССР. У 1939-м годзе абвяшчаецца партыяй правакатараў Кампартыя Заходняй Беларусі. Пры вызваленьні Заходняй Беларусі войскамі Чырвонай Арміі арыштоўваецца і зьнішчаецца вялікая частка беларускай інтэлігенцыі. Органамі ўнутраных справаў падпісваецца загад аб расстрэле 13 беларускіх пісьменьнікаў, у тым ліку – Коласа, Купалы, Куляшова, Лынькова.... Чаму мы ўважаем іхні лёс за самы трагічны? Была грамадзянская, Айчынная войны, якія забралі значна болей жыцьцяў. Але там быў вораг. Можна было змагацца і перамагаць. Была вера, што памяць будзе захаваная нашчадкамі. І, у рэшце рэшт, там, як гаворыцца, сьмерць не выбірала. А тут – выбірала... Самых разумных, самых сумленных, тых, хто ня ўмеў і не жадаў схіляць галаву... Інтэлектуальны патэнцыял нацыі, яе гонар і сумленьне.

Яшчэ ў пачатку 1930-х гадоў маральна быў забіты Купала... Вось вынікі сталінскіх рэпрэсіяў у Беларусі. Мы не павінны забываць пра тыя трагічныя для нашай нацыі гады, каб падобнае ніколі не паўтарылася...

Рэпрэсаваныя:

Дзяржаўныя дзеячы БССР Я. Дыла – наркам працы першага ўраду БССР, М. Гікала – першы сакратар ЦК КПБ, Я.Адамовіч – старшыня СНК у 1920-я гады, А.Сташэўскі – наркам юстыцыі БССР, А.Бенек – наркам земляробства, А.Чарнушэвіч – наркам асьветы, І. Убарэвіч – галоўнаркам Беларускай вайсковай акругі, М. Галадзед – старшыня СНК, З. Чарнушэвіч – наркам сацыяльнага забесьпячэньня, Я. Нёманскі – дырэктар Інстытуту эканомікі АН БССР, Я. Каранеўскі – рэктар Белдзяржуніверсітэту, а таксама Дзеніскевіч, Дубовік, Дубіна, Залескі, Капуцкі. У.Ігнатоўскі – прэзідэнт АН БССР, З. Некрашэвіч – віцэ-прэзідэнт АН БССР, В. Ластоўскі – сакратар АН БССР, акадэмік, Я. Лёсік – акадэмік, Г. Гарэцкі – дырэктар інстытуту, М. Байкоў і У. Дзеружынскі – мовазнаўцы, Воўк-Левановіч, Касьпяровіч, Я. Бяльковіч – мовазнаўцы, У. Пічэта – акадэмік, Шчакаціхін – мастацтвазнаўца, Петуховіч, Замоцін – дактары навук, А.Уласаў – рэдактар «Нашай нівы».

Палітычныя дзеячы Заходняй Беларусі – А. Луцкевіч, Б. Тарашкевіч, Я.Бабровіч, М. Брусевіч, П. Валошын, Ф. Валынец, Я. Гаўрылік, Я. Рак-Міхайлоўскі, Гарэцкі, Дварчанін, Лагіновіч, Канчэўскі і іншыя.

Паэты і пісьменьнікі – М. Гарэцкі, У. Галубок, А. Дзяркач, М. Багун, Н.Ватацы, А. Вечар, А. Вольны, П. Галавач, Ю. Гаўрук, М. Грамыка, С. Грахоўскі, У. Дубоўка, К. Грывіч, Б. Пасканьеў, А. Гурло, С. Дарожны, Ф. Гінтаўт, С. Дзяргай, А. Дудар, Я. Ермаловіч, У. Жылка, М. Зарэцкі, А. Звонак, У.Коваль, У. Казлоўскі, Л. Калюга, Т. Кляшторны, Р. Кобец, С. Куніцкі, С. Ліхадзіеўскі, Ю. Лявонны, В. Маракоў, Б. Мікуліч, А. Пальчэўскі, Я. Пушча, С.Ракіта, Э. Самуйлёнак, Я. Скрыган, В. Сташэўскі, Ю. Таўбін, С. Фамін, У.Хадыка, С. Хурсік, Н. Чарнушэвіч, Л. Чарняўская, М. Чарот, В. Шашалевіч, С. Шушкевіч, Л. Радзевіч, А. Салагуб, М. Краўцоў, С. Новік-Пяюн, Я.Багдановіч і іншыя.

*Акадэмія навук СССР. Інстытут этналогіі і антрапалогіі АН СССР.*
*Цэнтр па вывучэньні міжнацыянальных зносінаў. “Грамадзянскія рухі ў Беларусі. Дакументы і матэрыялы 1986-1991 г.г.”*
*Тэкст стэнаграмы захоўваецца ў прыватным архіве.*
*Падрыхтаваў да друку і пераклаў з расейскай мовы Сяржук СЫС.*